ЧЭРВЕНЬ 2022

**Кантрольная работа (дыктант)**
**для правядзення уступных іспытаў пры прыёме асоб у IX клас дзяржаўнай установы адукацыі «Мінскае абласное кадэцкае вучылішча» па вучэбным прадмеце «Беларуская мова»**

## На радзіме Янкі Купалы

Нарэшце пабываў я на радзіме Янкі Купалы. На гэтай святой і блізкай для кожнага беларуса зямлі.

Прайшоўшы кіламетры з два, мы апынуліся на ўскрайку вялікага поля. Ішлі палявою дарогай і думалі, што вось тут некалі таксама зрабіў свае першыя крокі маленькі Янка. Проста палявая сцежка. Але гэтак жа цвілі лубін, бульба, красавала жыта. І гэтак жа свяціла сонца, плылі лёгкія аблачыны. У маленькага Янкі тады было яшчэ ўсё наперадзе.

Яшчэ пошум родных бароў, звон крыніц і спеў птушак не пераплаўляліся ў чыстыя радкі, а толькі трывожылі, хвалявалі сэрца. Гэткае ж хваляванне адчулі і мы, ідучы вязынскімі сцежкамі.

Было ў вязынскіх краявідах столькі роднага, дарагога, беларускага, што аж заказытала нешта ў грудзях, зашчымела ў горле. (118 слоў)

*Паводле З. Прыгодзіча*